УДК 7.03(476)

# УЗНІКНЕННЕ БЕЛАРУСКАГА КЛУБА ВЯСЁЛЫХ І ЗНАХОДЛІВЫХ ЯК ФОРМЫ СУЧАСНАЙ СМЕХАВАЙ КУЛЬТУРЫ

# BEGINNING OF CHEERFUL AND RESOURCEFUL CLUB AS A FORM OF LAUGHTER CULTURE

**А. А. Гужалоўскі**
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

**A. A. Huzhalouski**
*Doctor of History, Professor, Belarusian State University (Minsk, Belarus)*

***E-mail:*** *huzhalouski@bsu.by*

*Артыкул прысвечаны аналізу ўзнікнення беларускага КВЗ-руху ў якасці эфектыўнага сродку пазавучэбнай актыўнасці студэнтаў. Папулярызацыя руху ў канцы XX – пачатку XXI ст. выклікала цікавасць даследчыкаў да яго вытокаў. Актуальнасць даследавання абумоўлена неабходнасцю асэнсавання КВЗ як дасугава-відовішчнай формы савецкай масавай культуры, якая дзякуючы выкарыстанню сродкаў масавай камунікацыі спалучалася з велізарнай аўдыторыяй, пераважна маладога ўзросту, і аказвала адчувальны ўплыў на фарміраванне яе густаў, пераваг, каштоўнасцей. КВЗ з'яўляўся адным з найбольш масавых маладзёжных рухаў у краіне, у які былі ўключаны мільёны ўдзельнікаў – як актыўных (гульцоў), так і пасіўных (назіраючых). Разгледжаны вытокі сучаснага КВЗ – танцавальна-музычнага маладзёжнага шоу з элементамі віктарыны, журы і вядучым. Нададзена ўвага ўзаемаадносінам удзельнікаў КВЗ з уладай.*
***Ключавыя словы:*** *клуб вясёлых і знаходлівых; тэлегульня; студэнт; сатыра; ідэялагічнае кіраўніцтва.*

*The article is devoted to the analysis of the emergence of the Belarusian Cheerful and Resourceful Club (CRC) movement as an effective means of extracurricular activity of students. Scholars are now interested in the movement's beginnings because of its rise to prominence in the late 20th and early 21st centuries. The study's importance stems from the necessity to comprehend the CRC as a type of Soviet mass entertainment and leisure that, via the use of mass media, was able to reach a large audience, primarily young people, and had a real influence on the development of its values, tastes, and preferences. With millions of members, both active (players) and passive (observers), CRC was one of the largest youth groups in the nation. It is shown how the first participants of this movement showed their civic qualities, artistry and creative abilities. The origin of the modern CRC – a dance and musical youth show with elements of a quiz, a jury and a presenter are considered. Attention is paid to the relationship of the Club participants with the authorities.*
***Keywords:*** *cheerful and resourceful club; TV game; student; satyre; ideological leadership.*

Час, які наступіў пасля XX з'езда КПСС і скончыўся адстаўкай М. С. Хрушчова, увайшоў у гісторыю пад назвай «адліга». Пасля скасавання ГУЛАГу з лагераў і ссылак вярталіся зняволеныя. Асуджэнне на XX з'ездзе КПСС культа асобы Сталіна абудзіла савецкае грамадства, спарадзіла веру, надзеі на змены да лепшага. На VI Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у 1957 г. у Маскве ўзнікла ілюзія адсутнасці «жалезнай заслоны». Палёт Ю. Гагарына ў космас у 1961 г. спарадзіў адчуванне бязмежнасці сіл чалавека. Палепшыўся ўзровень матэрыяльнага жыцця людзей. Лібералізацыя сацыяльна-палітычнага жыцця была моцным стымулам развіцця літаратуры і мастацтва. Час «адлігі» нарадзіў В. Быкава, У. Караткевіча, Р. Барадуліна, Б. Заборава, Г. Паплаўскага, А. Анікейчыка, Я. Глебава, Д. Смольскага і дзясяткі іншых творцаў, якія стварылі фундамент сучаснай беларускай культуры. Узнік новы

тып светапогляду, новы тып маладога чалавека – «шасцідзясятніка».

Эпоха «адлігі» суправаджалася новым эмацыйна-ўзвышаным светаадчуваннем, вядомым пад назвай «рамантыка». Тайга, вогнішча, каханне, песні пад гітару, прага прыгод, імкненне ўбачыць невядомыя далі апанавалі значную частку маладых людзей – «шасцідзясятнікаў». Маладыя рамантыкі, якія паступова зрабіліся сімвалам новага часу, імкнуліся да перамен, прыгод, яны шукалі шляхі самасцвярджэння і адмаўлялі аўтарытэт бацькоў. Нават вайна дзякуючы шматлікім фільмам і прыгодніцкім кнігам уяўлялася суцэльнай рамантыкай. Моладзь зайздросціла іх героям і шчыра шкадавала, што іх атачала звычайнае спакойнае жыццё. Ад яго хацелася з’ехаць у далёкія краі, каб там сустрэцца з цяжкасцямі і пераадольваць іх.

Савецкая прапаганда актыўна заклікала моладзь стаць рамантыкамі і накіравацца на «будоўлі стагоддзя». Для развіцця камуністычнага грамадства на працягу наступных 20 гадоў была неабходна актыўная падтрымка маладога пакалення. У 1960-я гг. на беларускім радыё была створана праграма «Рамантыкі», у Мінску адкрыўся студэнцкі клуб «Рамантык», праводзіўся рэспубліканскі фотаконкурс «Мы – рамантыкі».

Яшчэ адной важнай прыкметай эпохі «адлігі» стала вяртанне смеху як формы сацыяльнай камунікацыі, а адным з яе сімвалаў – з’яўленне тэлегульні «Клуб вясёлых і знаходлівых». У апошнія гады вывучэнне дадзенага сацыяльна-культурнага феномена распачалося шэрагам расійскіх і ўкраінскіх гісторыкаў, культуролагаў, сацыёлагаў. Да найбольш значных работ трэба аднесці вытрымаўшую тры выданні «энцыклапедыю КВЗ», падрыхтаваную М. Марфіным і А. Чывурыным [9]. У навуковай парадыгме разглядаемы феномен даследаваны ў дысертацыйных работах С. А. Янішэўскага [14], М. Н. Кавалёва [7] і Д. Р. Букланс [4]. У беларускай гуманітарыстыцы гэта тэма ў якасці самастойнай не разглядалася.

Мэтай дадзенай работы з’яўляецца рэканструкцыя станаўлення беларускага Клуба вясёлых і знаходлівых як формы маладзёжнай смехавай культуры.

Гульня нарадзілася 8 лістапада 1961 г. у маскоўскай студыі тэлебачання на Шабалаўцы і мела форму віктарыны. З цягам часу гэта форма эвалюцыянавала ў спаборніцтвы студэнцкіх каманд на лепшыя гумарыстычныя адказы на пытанні праціўнікаў, імправізацыі на зададзеныя тэмы, разыгрыванне загадзя падрыхтаваных сцэн і г. д. Выступы студэнтаў рабіліся ўсё больш відовішчнымі, сцэнічнымі, тэатральнымі. У першай палове 1960-х гг. перадача, якую транслявала на ўсю краіну моладзевая рэдакцыя Цэнтральнага тэлебачання, набыла вялікую папулярнасць – падчас яе паказу вуліцы савецкіх гарадоў пусцелі. КВЗ прыцягваў мільёны гледачоў нязмушанай формай, эфектам прамога эфіру, а найперш, вострымі жартамі над савецкай рэчаіснасцю, якія перыядычна праслізвалі праз сіта рэдакцыйнай цэнзуры. Сведчаннем папулярнасці тэлегульні стаў яе выхад за рамкі тэлеэкрана і пераўтварэнне ў форму маладзёжнай самадзейнасці, што абумовіла з’яўленне масавага руху КВЗ. Такім чынам, існавалі дзве разнастайнасці гульні – экранная і пазаэкранная.

Ініцыятарам стварэння першага ў Беларусі Клуба вясёлых і знаходлівых быў студэнт 5 курса Мінскага медінстытута Я. Басін, які летам 1963 г. наведаў моладзевую рэдакцыю Цэнтральнага тэлебачання, а таксама пазнаёміўся з сябрамі лепшых маскоўскіх каманд. Неўзабаве па вяртанні Я. Басін арганізаваў каманду студэнтаў-медыкаў, якая з поспехам дэбютавала на інстытуцкім навагоднім балі [1, с. 4]. Гэты дэбют быў заўважаны ў БДУ, дзе вельмі хутка паўстала ўласная каманда вясёлых і знаходлівых на чале з капітанам, студэнтам-фізікам М. Полазавым. У канцы лютага 1964 г. паміж двума камандамі адбылася тэлесустрэча, арганізаваная рэдактарам Мінскай студыі тэлебачання А. М. Пустаходам.

Першае пасяджэнне беларускага Клуба вясёлых і знаходлівых, якое скончылася перамогай каманды БДУ з лікам 52:50, выклікала вялікі розгалас у горадзе. Адным падабаліся артыстычныя здольнасці студэнтаў, іх манера раскавана трымацца перад тэлекамерамі, а таксама энтузіязм балельшчыкаў у зале. Іншыя асуджалі з’едлівыя жарты пра тагачасны Мінск: перапоўнены транспарт у гадзіны-пік, схаваныя ад пакупнікоў кнігі скаргаў і рака Свіслач, выгляд якой не пасаваў

сталічнаму гораду [5, с. 3]. Да ліку апошніх адносіўся старшыня Камітэта Савета Міністраў БССР па радыёвяшчанні і тэлебачанні В. П. Несцяровіч, які абвясціў строгую вымову двум рэдактарам Мінскай студыі «за сур'ёзныя памылкі ў перадачы "КВЗ-64"» [11, арк. 43].

Пасля дэбютнага пасяджэння беларускага Клуба вясёлых і знаходлівых адборачныя турніры прайшлі ў многіх вышэйшых навучальных установах рэспублікі. У Гродна ў іх удзельнічалі каманды ўсіх трох ВНУ горада – педагагічнага, медыцынскага і сельскагаспадарчага [3, с. 2]. Развіццю руху КВЗ у абласных цэнтрах дапамагалі больш вопытныя мінчане, якім часта даводзілася быць сцэнарыстамі, вядучымі і членамі журы. Лепшыя рэгіянальныя каманды траплялі на рэспубліканскае тэлебачанне.

КВЗ быў яскравым відовішчам прамога эфіру, напоўненым экспромтам, жвавым словам і бліскучым гумарам. Сцэна і глядзельная зала ўтваралі адзіную карнавальную прастору, аб'яднаную смехам. Падрыхтоўка да гульні ўключала нараджэнне сцэнічнай ідэі, абгаворванне спосабаў яе ўвасаблення, рэпетыцыйны перыяд. Вынікі выступаў каманд, якія ў многім залежалі ад артыстызму і фантазіі гульцоў, абмяркоўваліся іх удзельнікамі з мэтай пазбаўлення ад няўдалых жартаў і нестыковак.

Гульні вясёлых і знаходлівых кідалі выклік савецкаму афіцыёзу з урачыстымі сходамі, афіцыйнымі прамовамі, фальшывасцю. Уласна нефармальна-сяброўскія творчыя адносіны, у якіх нараджаліся праграмы КВЗ, супрацьстаялі адміністрацыйна-бюракратычнай іерархіі савецкага грамадства. Вось як перадае працэс падрыхтоўкі каманд КВЗ да гульняў удзельнік першай зборнай БССР В. І. Ледзенеў: «Мы часта збіраліся разам, блукалі па вуліцах, жартавалі над мінакамі, пілі сухое віно ці каву і абавязкова каго-небудзь разыгрывалі. Мы адназначна адчувалі сябе адзіным цэлым. Але што датычылася кавэзэшнай дзейнасці… Так, мы прыдумлялі, складалі, ставілі мізансцэны, але і памыляліся, сварыліся, раздражняліся. Тым не менш, рабілі ўсё самі – ад напісання двухрадкоўя да агульнага рашэння тэмы» [8, с. 28].

Акрамя вышэйшых навучальных устаноў, гульні мясцовых каманд КВЗ ладзіліся ў тэхнікумах, школах, піянерскіх лагерах і г. д. Непадкантрольнасць зместу выступленняў іх удзельнікаў выклікала непакой у ідэалагічнага кіраўніцтва. Выступаючы на нарадзе ідэалагічных работнікаў рэспублікі 21 лістапада 1966 г., сакратар ЦК КПБ па ідэалогіі С. А. Пілатовіч наступным чынам выказаўся пра ахапіўшую школы моду на гульні вясёлых і знаходлівых: «Удалыя самі па сабе гэтыя формы правядзення вольнага часу школьнікаў дзе-нідзе сталі ператварацца ў забаўку і нават прыносіць шкоду» [10, арк. 59]. Міністэрства культуры БССР адрэагавала на словы галоўнага ідэёлага рэспублікі метадычкай, дзе падрабязна распавядалася, пра што і як трэба было жартаваць, а таксама прапаноўваўся сцэнар для жадаючых арганізаваць спаборніцтвы ў сваёй навучальнай установе [6].

Пералік забароненых для жартаў тэм дапаможнік не змяшчаў, што ў значнай ступені ўскладняла жыццё арганізатараў гульняў вясёлых і знаходлівых. Паступова на першы план выходзіла такая прыкмета сцэнарных распрацовак, як сацыяльная і маральная прымальнасць аб'ектаў жартаў. Тое, што нельга смяяцца над першымі асобамі партыі і дзяржавы, а таксама камуністычнай ідэалогіяй, савецкія людзі ведалі з маленства. Але дзе знаходзілася хісткая мяжа, якая аддзяляла выкрываючую недахопы сатыру ад ідэалагічнай дыверсіі?

Кульмінацыяй эпохі весялосці стаў удзел беларускай зборнай КВЗ у гульнях сезона 1965/66 г. Пасля перамогі ў паўфінале над камандай Маскоўскага інстытута нафтахімічнай і газавай прамысловасці мінчане выйшлі ў фінал, дзе сышліся ў двубоі з камандай «Волга-66». Гульня была падпарадкавана жорсткаму сцэнару, выступы каманд рыхтаваліся загадзя, нагадваючы ўсё менш студэнцкі капуснік і ўсё больш – прафесійны эстрадны спектакль. «Разам з ватманам, тушшу, нажніцамі і клеем каманда страціла частку экспромтаў і свабодную імправізацыю», – з сумам канстатаваў неўзабаве пасля заканчэння гульні адзін з яе ўдзельнікаў Б. Пастэрнак [13, с. 4].

Сутыкнуўшыся на падрыхтоўчым этапе з цэнзурай маладзёжнай рэдакцыі Цэнтральнага тэлебачання, выхаваўчымі размовамі партыйных ідэёлагаў, а таксама прысутнасцю за кулісамі супрацоўнікаў КДБ, удзельнікі беларускай зборнай раз-

глядалі два варыянта развіцця далейшых падзей: абвясціць са сцэны перад пачаткам гульні аб сваёй адмове ўдзельнічаць у ёй або пагадзіцца з цэнзарскімі праўкамі і праігнараваць іх падчас гульні. У выніку доўгіх спрэчак перамаглі прыхільнікі другой стратэгіі. Гэтаму паспрыла тое, што на афіцыйным узроўні прынцып імправізацыйнасці працягваў дэклараваца, бо без яго знік бы эфект непрадказальнасці выніку спаборніцтва. Дзякуючы абмежаванаму дазволу на імправізацыю падчас фінальнай гульні з вуснаў мінчан у прамым эфіры прагучала нямала жартаў, якія прымушалі моцна нэрвавацца вядучых С. Жыльцову і А. Маслякова. Сярод іх быў знакаміты жарт Я. Басіна: «Спачатку завізіруй, потым імправізіруй!» (рэдактары раілі варыянт: «Спачатку рэпетыруй, потым імправізіруй!»), які адразу ж стаў крылатым. Пародыя на камсамольскіх функцыянераў, прадстаўленых у выглядзе гномаў з мультсерыяла У. Дыснэя, была катэгарычна забаронена для сцэнічнага ўвасаблення [12].

Пасля агульнасаюзнай тэлевізійнай трансляцыі фінала КВЗ 1965/66 г. гульцоў славутай беларускай зборнай М. Полазава, Я. Басіна, В. Ледзенева, Б. Пастэрнака, Р. Нічыпаровіча, О. Бельзацкага, П. Берліна, Д. Мохава і інш. пачалі пазнаваць у Мінску, як кіназорак, у твар. 23 мая 1966 г. 57-гадовы мінскі журналіст Я. І. Садоўскі запісаў у дзённіку: «Учора да 12-й ночы глядзеў тэлевізар. Ішла фінальная перадача КВЗ Горкі – Мінск. Увесь час перамагаў Мінск і хлопцы насамрэч былі вясёлыя і знаходлівыя. Але пад канец журы відавочна перацягнула і прысудзіла перамогу Горкаму (49–47 ачкоў). Такім чынам Мінск на другім месцы. Яму прысудзілі сярэбраны медаль. Але ва ўсякім разе ў гэты нядзельны вечар мільёны тэлегледачоў маглі на свае вочы пераканацца ў дасціпнасці мінчан» [2, арк. 131].

Разам са з'яўленнем напрыканцы 1960-х гг. ідэалагічных замаразкаў, пачаўся заход эпохі КВЗ. Логіка развіцця гульні патрабавала пашырэння тэм і ўзмацнення сатырычнага пачатку. Але пасля здушэння «пражскай вясны» сатыра і вальнадумства выклікалі ў савецкага кіраўніцтва складаную гаму пачуццяў – ад разражнення да страху. Узмацнілася рэдактарская цэнзура, праз якую праходзілі ўсе без выключэння элементы спаборніцтва, найперш «прывітанне каманд» і «хатняе заданне». Перадача дэфармавалася, развальвалася, але выходзіла, паступова губляючы былую папулярнасць. У сезоне 1971/72 г., за год да яе закрыцця на Цэнтральным тэлебачанні, беларуская каманда (зборная БПІ) усё ж здолела стаць чэмпіёнам КВЗ. У той год трансляцыя фінальнай гульні ішла ўжо ў запісу.

Такім чынам, КВЗ як з'ява моладзевага асяроддзя карысталася павагай сярод самых розных моладзевых груп у якасці папулярнага і актуальнага руху. Прыцягненне студэнтаў да ўдзелу ў руху КВЗ дазваляла наблізіцца да вырашэння тагачасных патрабаванняў вышэйшай адукацыі і рэалізоўваць у працэсе гульняў новыя формы пазавучэбнай дзейнасці. КВЗ быў адначасова і школай зносін, і тэрыторыяй развіцця камунікатыўных навыкаў, і прасторай актыўнай карыснай дзейнасці. У працэсе падрыхтоўкі і ўдзелу ў гульнях КВЗ студэнты пазбаўляліся ад комплексаў, удасканальвалі навыкі акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства, павышалі ўзровень культуры, фармавалі здольнасці прымаць кіраўнічыя рашэнні, развіваюць крэатыўнае мысленне.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Басін, Я.* На вячэрняй хвалі – КВЗ / Я. Басін // Чырвоная змена. – 1964. – 1 лют. – № 22.
2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 92. – Воп. 1. – Спр. 269.
3. *Бельский, Р.* «Снайперы» из педагогического / Р. Бельский // Знамя юности. – 1966. – 27 апр. – № 83.
4. *Букланс, Д. Г.* КВН как феномен современной массовой культуры: коммуникативные аспекты: дис. ... канд. культурологии: 24.00.01 / Букланс Дмитрий Григорьевич. – Киров, 2010. – 182 с.
5. *Карпава, Г.* Мінскі КВЗ: удачы і пралікі / Г. Карпава // Чырвоная змена. – 1964. – 4 сак. – № 45.
6. КВН: Сценарий клуба веселых и находчивых. – Минск: М-во культуры, Респ. метод. каб. культпросветработы, 1966.

7. *Ковалев, М. Н.* КВН (Клуб веселых и находчивых) как социокультурное явление современной России: дис. ... канд. социологических наук: 22.00.06 / Ковалев Михаил Николаевич. – Москва, 2004. – 139 с.

8. *Леденев, В.* Мы начинали КВН / В. Леденев // СБ – Беларусь сегодня. – 2002. – 21 дек. – № 287.

9. *Марфин, М.* Что такое КВН? / М. Марфин, А. Чивурин. – Киров: Междунар. Союз КВН, 2002. – 173 с.

10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4п. – Воп. 95. – Спр. 112.

11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 871. – Воп. 2. – Спр. 732.

12. *Никифорович, Г. В.* КВН давних времен: свидетельство первопроходимца / Г. В. Никифорович // Мастерская. – 2019. – 8 нояб. – URL: https://club.berkovich-zametki.com/?p=51606 (дата звароту: 1.09.2022).

13. *Пастэрнак, Б.* ...А цяпер – за мемуары! / Б. Пастэрнак // Чырвоная змена. – 1966. – 14 чэрв. – № 116.

14. *Янішевський, С. О.* КВН як соціокультурне явище: генеза, історія розвитку, сучасний стан: дис. ... канд. іст. наук: 17.00.01 / Янішевський Сергій Олександрович. – Київ, 2004. – 185 арк.


***Паступіў / Received:*** *19.01.2025*